**Літаратура**

1. Баранов М.Т. Пути развития у школьников V–VIII классов интереса к уроку русского языка // Воспитание интереса к урокам русского языка. М., 1965.

**Л.С. Васюковіч**

# ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ШКОЛЬНАГА ПАДРУЧНІКА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Вучэбнае кнігавыданне адыгрывае адметную ролю ў развіцці цывілізаванага грамадства: навуковы і культурны змест тэкстаў падручнікаў адлюстроўвае ўзровень, адэкватны найноўшым дасягненням тэарэтычнай думкі. Падручнік акумулюе не толькі лінгвістычную інфармацыю і спосабы дзейнасці з ёй, але і культурныя каштоўнасці, агульначалавечыя маральныя нормы, увасобленыя ў тэкстах. Рэтраспектыўны аналіз вучэбных выданняў дае падставу сцвярджаць, што падручнікі па мове ўтрымліваюць духоўныя набыткі грамадскай думкі, выступаюць умовай пераемнасці ў развіцці лінгвістычных і педагагічных поглядаў. Падручнік належыць да тых з’яў культуры, якія патрабуюць пастаяннага ўдасканалення, увагі, аналізу, аб’ектыўных ацэнак. Вучэбная кніга каштоўная як значнасцю навуковага зместу, так і дыдактычнай перапрацоўкай прапанаванай інфармацыі. На думку прафесара Н.Б. Мячкоўскай, менавіта матэрыял, адабраны і ўключаны ў падручнік, “набывае значнасць нарматыўна-лінгвістычнага, а таксама ідэалагічнага і мастацка-эстэтычнага канона ў соцыуме” [4, с. 3].

Ва ўмовах сучаснага грамадства роля вучэбнай кнігі ўзрастае, паколькі яна застаецца эталонам навуковай думкі, выкладзенай лагічна, паслядоўна, сістэмна. Падручніку ў адрозненне ад іншых масавых выданняў неўласцівыя неабгрунтаваныя трансфармацыі зместу з прычыны фарміравання зыходных, канцэптуальных асноў пэўнай дысцыпліны, традыцыйных, базавых спосабаў пазнавальнай дзейнасці. Нават пры арганічных эвалюцыйных зменах падручнік застаецца стабільным у плане дыдактычнай арганізацыі вучэбнага матэрыялу, закліканага вытлумачваць, даказваць, ілюстраваць, інтэрпрэтаваць моўныя факты, вучыць рабіць вывады ў працэсеназіранняў і абагульненняў. Падручнік як кампанент педагагічнай сістэмы ствараецца ў канкрэтных гістарычных і культурных умовах. Функцыянаванне яго адбываецца не ў аморфным, бязлікім

асяроддзі, а ва ўзаемадзеянні з іншымі элементамі метасістэмы. Рэалізацыя дыдактычных функцый выдання знаходзіцца ў прамой залежнасці ад каардынат, прынятых на адукацыйным зрэзе.

На пэўным этапе свайго функцыянавання падручнік можа перастаць задавальняць патрэбнасці, запыты асобы і лінгвакультурнай супольнасці. Такая сітуацыя развіваецца пры ўмове тэарэтычнага абгрунтавання новых канцэптуальных падыходаў да выкладання мовы. У кантэксце прынятых метадычных парадыгмаў мэтазгодная замена дыдактычнай сістэмы альбо яе своечасовая рэканструкцыя з мэтай выпрацаваць кампраміс паміж новымі патрэбнасцямі і рэальнымі магчымасцямі. Падобныя замены азначаюць не толькі перыядычнасць развіцця тэорыі школьнага падручніка па мове, але і стадыяльнасць, ступеньчатасць фарміравання адукацыйнай сістэмы наогул. Маем на ўвазе, што любыя педагагічныя аб’екты праходзяць праз этапы жыццядзейнасці, ва ўмовах якіх нават новы падручнік будзе ўтрымліваць рысы папярэдніх выданняў. Такія этапы, арганічна ўбіраючы элементы здаровага кансерватызму, забяспечваюць аб’ектыўныя ўмовы для станаўлення наступнай якаснай ступені. Сучасны ўзровень тэорыі школьнага падручніка прадвызначае перспектывы ўдасканалення вучэбнай кнігі па мове.

Зместавыя лініі развіцця падручніка найперш звязаны з яго **новымі функцыямі** ў структуры **вучэбна-метадычнага комплексу** (ВМК) па беларускай мове. Традыцыйна падручнік служыць асноўным сродкам навучання, цэнтральным кампанентам вучэбнага працэсу, які аб’ядноўвае ўсіх яго ўдзельнікаў – вучняў, настаўніка і аўтара. Падручнік па праву мае статус ядра ВМК, паколькі акрэслівае ўслед за праграмай тактыку, стратэгію і сістэму навучання мове ў цэлым – мэты, змест і прынцыпы лінгвістычнай адукацыі. Апроч гэтага, вучэбная кніга непасрэдна кіруе працэсам пазнання і абумоўлівае характар дзейнасці настаўніка.

Як вядома, **вучэбна-метадычны комплекс** уяўляе сістэму дыдактычных сродкаў па пэўнай дысцыпліне і ствараецца з мэтай найбольш поўнай рэалізацыі адукацыйных і выхаваўчых задач. На сённяшні дзень – магчыма, у сілу таго, што ва ўмовах беларускай адукацыі ідэя ВМК мае першыя набыткі, – вучэбныя выданні рыхтуюцца і ўспрымаюцца як самастойныя элементы, якія расцэньваюцца як дадатак да падручніка. Кампаненты комплексу падаюць матэрыял у розным аб’ёме і паслядоўнасці, даведачны апарат, як правіла, будуецца паводле неаднастайных прынцыпаў, тэрміналогія і нават умоўныя абазначэнні не заўсёды ўніфікаваныя, выданні адрозніваюцца паводле свайго

паліграфічнага і мастацкага афармлення, не прасочваюцца ўнутрыдысцыплінарныя сувязі.

Традыцыйна для забеспячэння вучэбна-выхаваўчага працэсу падручнікі, метадычныя і наглядныя дапаможнікі распрацоўваліся разрознена, аднаасобна. У выніку гэтага методыка стварэння кампанентаў ВМК у адрыве ад працэсу канструявання іншых выданняў мела невялікі ўплыў на падрыхтоўку падручнікаў. Адпаведна сродкі навучання мелі функцыянальна-прыкладны характар. Метадычнае забеспячэнне не разглядалася ў рэчышчы сістэмнага падыходу, з навукова-метадалагічных пазіцый, рэкамендаваныя дапаможнікі, як правіла, малаэфектыўныя найперш у аспекце самастойнай і індывідуальнай работы. З улікам пераходу адукацыі да антрапацэнтрычнай мадэлі навучання абнаўляюцца мэты і змест ВМК. З улікам дыдактычных функцый пры стварэнні сучаснага ВМК павінны ўлічвацца наступныя патрабаванні:

- падрыхтоўка комплексу пачынаецца з асэнсавання метадалагічных установак, на аснове якіх ВМК мысліцца як мабільная сістэма дыдактычных сродкаў, аб’яднаных інтэграванай і каардынуючай, а таксама функцыямі матывацыі і кіравання пазнавальнай дзейнасцю вучняў;
- улік прамых і ўскосных лагічных сувязей паміж вучэбнымі выданнямі, якія, будучы самастойнымі і самадастатковымі, маюць узаемаабумоўлены і сузалежны характар;
- рэалізацыя прынцыпу паслядоўнасці і пераемнасці пры выкладзе вучэбнага матэрыялу;
- забеспячэнне ўнутрыдысцыплінарных сувязей паміж выданнямі комплексу;
- агульная структура выданняў і прынцыпаў фарміравання даведачнага апарата;
- выкарыстанне аўтарамі дапаможнікаў агульнага паняційнага апарата, уніфікацыя тэрміналогіі і абазначэнняў;
- недапушчальнасць неапраўданага дубліравання матэрыялу;
- інтэграцыя традыцыйнай методыкі навучання з інавацыйнымі тэхналогіямі; захаванне адзінства мастацкага афармлення выданняў ВМК.

Дыдактыка-метадычная структура падручніка ў аптымальным варыянце перадае логіку вучэбных аперацый, паслядоўнасць якіх абумоўлена структурай пазнавальнай дзейнасці. Яе першы этап – дэманстрацыя, успрыманне і аналіз фактаў – патрабуе якаснага, адэкватнага асэнсавання ўзораў вывучаемага матэрыялу. Структура

дзейнасці падразумявае этап узнаўлення, што вымагае не толькі імітацыі прапанаваных дзеянняў, але і абавязковага іх вытлумачэння, дэталізацыі. Вучэбная дзейнасць у абавязковым парадку прадугледжвае творчы ўзровень, на якім задзейнічаны не аднастайныя, а варыятыўныя практыкаванні, заданні. Гэта прадугледжвае такія вучэбныя аперацыі, як канструяванне, трансфармацыя, камбінацыя, перакадзіраванне моўнага і маўленчага матэрыялу. Этап надзвычай істотны: як вядома, пераканструяваць, трансфармаваць можна толькі тое, што зразумела і асэнсавана. Апошні этап – прымяненне атрыманых ведаў на практыцы ў розных відах маўленчай дзейнасці.

Сучасная сацыякультурная сітуацыя характарызуецца пераходам ад маналагічнай сістэмы светаўспрымання да дыялагічнай, што стымулюе ўвагу да магчымасцей моўнай асобы, навыкаў уступаць у дыялог, падтрымліваць яго. **Ідэя** гарманічнай **дыялагізацыі вучэбнага працэсу** з'яўляецца ключавой для нашага часу. З улікам гэтага запатрабавана не ўменне фармуляваць гатовыя адказы на пытанні падручніка, настаўніка, а ўменне выяўляць сутнасць праблемы, супярэчнасці, выключэнні пры аналізе моўных фактаў. Адпаведна пашыраецца разуменне дыялогу і дыялагічных формаў працы ў вучэбнай кнізе. Ад спрошчанага ўспрымання "размовы паміж дзвюма або некалькімі асобамі" адбываецца падрыхтаваны найперш філосафамі (М.М. Бахцін, В.С. Біблер, В.Э. Ільенкаў) пераход да вытлумачэння дыялогу як спосабу чалавечага быцця, як механізма творчага мыслення, як спосабу выкладу вучэбнага матэрыялу. Паступова фарміруецца перакананне ў тым, што ісціна (жыццёвая, навуковая) існуе, аднак яна "прынцыпова не месціцца ў межах адной свядомасці" і "нараджаецца ў выніку сутыкнення розных свядомасцей" [1, с. 12].

У аспекце дыялагічнай культуры недасканалым бачыцца падручнік як склад лінгвістычнай інфармацыі, як канцэнтрацыя маналагізаваных ведаў, зборнік абсалютных ісцін, які адназначна асвятляе праблему, нават не спрабуючы прапанаваць розныя погляды, пазіцыі вучоных-моваведаў. Дыялогавае навучанне як першасна асабовае можа адбывацца толькі на аснове дыялагічнага (не па форме, а па сутнасці) тэксту. Пры гэтым істотна мяняецца пазіцыя настаўніка: з носьбіта маналагічных, адназначных ведаў ён становіцца пасрэднікам паміж падручнікам і вучнем, ператвараецца ў арганізатара дыялогу, які пераконвае аднадумцаў у разуменні дыялектычнага быцця слова.

Перспектыўнай лініяй развіцця з'яўляецца арганічнае **ўзаемадзеянне электронных і традыцыйных падручнікаў** на друкаванай аснове.

Мэтазгодна сцвярджаць пра аптымальнае суіснаванне выданняў, а не пра тое, якая форма прадстаўлення інфармацыі будзе дамінаваць. Тым больш, што кожная дысцыпліна мае раздзелы, дзе выкарыстанне мультымедыйных сродкаў навучання дарэчнае і пажаданае.

Так, у апошнія гады разгарнулася дыскусія аб магчымай замене традыцыйных формаў камунікацыі электроннымі. Аднак, спасылаючыся на аўтарытэтныя крыніцы (напрыклад, справаздача Расійскай кніжнай палаты), можна гаварыць, што сёння існуе мноства прагнозаў развіцця інфармацыйных працэсаў у грамадстве, але ні адзін з іх не ўтрымлівае сцвярджэнняў, аргументаў адносна адмірання кнігі як шматфункцыянальнага прадукта. Значны рост кніжнай вытворчасці ў другой палове XX ст. прыходзіцца на краіны, у якіх у найбольшай ступені атрымалі развіццё новыя інфармацыйныя тэхналогіі, – Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Японіі. Так, даследчыкі Брытанскай бібліятэкі, якія распрацавалі прагноз электроннага навуковага кнігавыдання да 2008 г., канстатавалі, што нават у такой сферы грамадскай практыкі, як навука, выпуск традыцыйных друкаваных выданняў будзе расці. У тым, што інфармацыйныя сродкі ёсць далёка не раўнацэнная замена кнігі, прызнаюцца самі распрацоўшчыкі праграмных прадуктаў. Падобныя заявы робяцца і на дзяржаўным узроўні: “Нягледзячы на існаванне электронных СМІ, кніга пакуль што застаецца найвялікшым здабыткам нашай цывілізацыі. Гэта асноўная база для атрымання ведаў, асабліва што датычыцца ведаў спецыяльных, навучальных, энцыклапедычных і даведачных” [3, с. 3].

На сённяшні дзень прасочваецца выразная тэндэнцыя да аб’яднання кніжных і электронных сродкаў у комплексныя праграмы навучання. Замежны вопыт таксама ацэньвае як перспектыўную практыку прадстаўлення вучэбнай інфармацыі на магнітных і аптычных носьбітах, якія выпускаюцца ў якасці дадатку да падручніка.

Такім чынам, перспектыўным бачыцца падручнік, які:

- утрымлівае не толькі прадметныя, але і метадалагічныя веды – аб прыёмах самастойнага пошуку, адбору, асэнсавання, перапрацоўкі лінгвістычнай інфармацыі вучэбных тэкстаў;
- мае дыялогавы характар навучання, скіраваны на дыялектычнае бачанне прадмета абмеркавання, на выяўленне ўласнай пазіцыі, яе дэманстрацыю і аргументацыю;
- фарміруе абагульненыя інтэлектуальныя спосабы дзейнасці;
- тэксты якога выступаюць лінгва-сэнсавым і рытарычным эталонам для моўнай асобы;

- утрымлівае механізм самакантролю, самакарэкцыі і самаацэнкі індывідуальных вучэбных дасягненняў;
- раскрывае тэхналогію вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Методыка падрыхтоўкі сучаснага падручніка падразумявае творчае асэнсаванне папярэдняга вопыту па стварэнні вучэбнай кнігі, захаванне класічных, прагрэсіўных набыткаў пройдзенага шляху з выкарыстаннем найноўшых адукацыйных тэхналогій.

**Літаратура**


1. Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества. Изд. 2-е. М.: Искусство, 1986. 444 с.
2. Зуев Д.Д. Школьный учебник. М.: Педагогика, 1983. 240 с.
3. Лапцёнак І. Мы ствараем беларускі нацыянальны падручнік // Настаўніцкая газета. 2002. 3 снежня. С. 3.
4. Мечковская Н.Б. Концепция и методы грамматик XVI–XVII веков как элемента книжно-письменной культуры восточного славянства: Автореф. дис… д-ра филол. наук: 10.02.02. Мінск, 1986. 38 с.


**Г.Ф. Герасіменка**

## ВЫКАРЫСТАННЕ ДЫСКУРСІЙНЫХ ФОРМ НАВУЧАННЯ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

Праблема фарміравання творчай асобы спецыяліста, прафесіянала ў межах новай педагагічнай парадыгмы вышэйшай школы сёння надзвычай актуальная. Незалежна ад сутнасці і спецыфікі вучэбнай дысцыпліны на першы план выступае задача навучыць студэнтаў арыентавацца ў інфармацыйнай плыні, узброіць інструментам адбору і крытычнага асэнсавання фактаў, з’яў, бачыць выключэнні з правілаў. У сувязі з гэтым функцыя выкладчыка ў некаторай ступені мяняецца. Сёння выкладчык павінен будаваць заняткі такім чынам, каб кожны студэнт стаў непасрэдным удзельнікам практычнай дзейнасці, меў магчымасць выказаць тэарэтычны, навуковы пункт гледжання па тэме, прадставіць свае адказы на пытанні. Стварэнне атмасферы творчага пошуку – галоўная ўмова, якая павінна быць забяспечана ў працэсе падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення заняткаў.

У гэтым выкладчыку павінны дапамагчы такія формы і спосабы арганізацыі навучальна-пазнавальнай дзейнасці, акія арыентаваны на праблемна-дыялогавае, індывідуалізаванае навучанне. Мэтай такога